**Рынкевіч, К.** Гартаючы мінулага старонкі, дзень новы з верай ў добрае сустрэць / К. Рынкевіч // Міёрскія навіны. – 2016. – 13 лют. – С. 4–5.

# ГАРТАЮЧЫ МІНУЛАГА СТАРОНКІ, ДЗЕНЬ НОВЫ З ВЕРАЙ Ў ДОБРАЕ СУСТРЭЦЬ



**У глыбіні шафы захоўваецца вялікі фотаальбом у карычневай вокладцы. На кардонных лістах шмат чорна-белых здымкаў. А яшчэ – павестка аб прызыве на вайсковую службу з датай 3-га кастрычніка 1985 года і выразаная з газеты публікацыя – загад аб дэмабілізацыі, надрукаваны ўвосень 1987-га.**

Калі набліжаецца 15 лютага, гаспадар дастае альбом, гартае цвёрдыя старонкі, і зноў ажываюць успаміны. На фота ўсміхаюцца маладыя салдаты, а на душы журботна.

– Вайна ёсць вайна, нічога добрага ў ёй няма, – гаворыць былы воін-афганец Вячаслаў Ходас. – Гады службы прыгадваць цяжка, ды і ці варта мінулае варушыць. Асобныя ўспаміны хочацца глыбей схаваць у памяці.

Вячаслаў Альфрэдавіч не перачытвае пісьмы, што пісаў бацькам, рэдка глядзіць фільмы і слухае песні пра Афганістан. Каб лішні раз душу не трывожыць. Але штогод у лютым выразнымі карцінамі паўстае ў памяці мінулае, і ўсё больш яскравым становіцца ўсведамленне таго, праз што давялося прайсці і… выжыць. Бачыў, як на мінах узрываліся машыны, слухаў жахлівую "музыку" страляніны… Пра страх і небяспеку тады не думалася.

– Зазірніце ў альбом. Можна сказаць, мы дзецьмі ў Афган трапілі. Мне 18 было. Юнацкі запал, жаданне суровай рамантыкі, – гаворыць субяседнік. – Гэта пасля стаў разважаць і ўсё асэнсоўваць.

На службу ў армію Вячаслава Ходаса прызвалі, калі вучыўся ў Брэсцкім радыётэхнічным вучылішчы на тэлемайстра. Маладых салдат прывезлі ў Барысаў, адкуль праз тыдзень іх забраў сяржант з сакавітым сонечным загарам.

– Мы адразу звярнулі ўвагу на гэты загар. На дварэ ж восень стаяла, – прыгадвае былы воін. – Калі прыехалі ў Маскву на чыгуначны вакзал, адзін з хлопцаў прамовіў: «Напэўна, у Афган трапім». Па тым, як разгубіўся сяржант, зразумелі, што так і будзе, хоць дакладна нам не паведамілі.

Тры месяцы вучэбкі ў Тэрмезе, што на мяжы з Афганістанам, а пасля вайсковая часць у горадзе Баграм. Служыў у агітатрадзе, які налічваў да 20 салдат. Праводзілі агітацыйную работу, кантактавалі з афганскай арміяй, аказвалі дапамогу мірнаму насельніцтву. Для мясцовых жыхароў салдаты-іншаземцы былі чужакамі, але гуманітарную падтрымку – прадукты харчавання, адзенне, дзіцячыя цацкі і іншыя рэчы – прымалі ахвотна. Размаўлялі з дапамогай перакладчыка, паступова запаміналіся словы афганскіх гаворак. Разам з асноўнымі абавязкамі прымалі ўдзел у баявых дзеяннях. Вячаслаў у часці заставацца не любіў, таму

ўзбройваўся і апранаў каску з бронекамізэлькай не раз. У спякотным клімаце такое абмундзіраванне стварала нязручнасці, але па-іншаму нельга.

Сярод баявых таварышаў з'явіліся сябры. З беларусаў у атрадзе быў толькі ён. Служылі калмыкі, расіяне, украінцы. Сувязь з некаторымі падтрымліваецца. Не так даўно ў «Аднакласніках» знайшліся таварышы па службе і медсястра з Расіі.

Кожны год прыходзіць Вячаслаў Альфрэдавіч на мітынг, прысвечаны чарговай гадавіне вываду савецкіх войск з Афганістана. Памятаюць пра воіна-інтэрнацыяналіста ў Шаркаўшчынскім раёне, адкуль ён родам, запрашаюць на ўрачыстыя мерапрыемствы ў суседні райцэнтр.

Афганскае мінулае пакінула нямала сумных момантаў, аднак Вячаслаў Ходас стараецца акцэнтаваць увагу на сённяшнім дні, заўважаць добрае.

– Мяне заўсёды падтрымлівала жонка Алена Іосіфаўна, вучыла бачыць светлы бок жыцця, мець стасункі з пазітыўнымі людзьмі, – кажа ён. – Ні яна, ні сын ніколі не прасілі расказаць пра службу, бо ведалі, што мне складана пра гэта гаварыць.

Вячаслаў Альфрэдавіч і яго спадарожніца жыцця разам працуюць у раённым аддзяленні Дэпартамента аховы. Стаж электраманцёра налічвае 18 год. У калектыве яго цэняць і паважаюць за адказнае стаўленне да справы, высокі прафесіяналізм і неспатольнае імкненне да ўдасканалення.

Энергіі хапае і на працоўныя справы, і на гаспадарчыя клопаты. Ва ўласным доме ў вёсцы Мельніца іх заўсёды шмат. Агарод, сад, хатняя жывёла – на ўсё гэта патрабуюцца час і сілы, жаданне і ўмелыя рукі. З ахвотай і цікавасцю гаспадар прышчэпліваў яблыні, эксперыментаваў з новымі сартамі, але вырашыў аддаць перавагу антонаўцы, беламу наліву, малінаўцы і іншым звыклым да нашага клімату дрэўцам. Сам змайстраваў розныя прыстасаванні да мотаблока, захоплена расказвае, як працуе капалка ўласнай вытворчасці.

Даглядаць гаспадарку дапамагае сын Сяргей. Хлопец атрымаў спецыяльнасць праграміста ў Віцебскім політэхнічным каледжы, працуе ў падатковай інспекцыі. Студэнт-завочнік адной са сталічных ВНУ. Дарэчы, менавіта прафесійны выбар сына дабавіў захапленняў бацьку. У асваенні камп'ютарных праграм Вячаслаў Альфрэдавіч дасягнуў значных вышынь. Новым ведам і ўменням знайшлося прымянне і на службовым пасту.

У марах пра будучае былы воін-афганец не будуе паветраных замкаў:

– Хочацца, каб былі здаровымі родныя і блізкія, каб шчаслівa склалася жыццё ў сына. Нельга дапусціць, каб цяперашнія маладыя хлопцы прайшлі праз тыя выпрабаванні, з якімі давялося сустрэцца нам.

…Адгарнецца лісток календара, і дні пабягуць звыклымі маршрутамі. Схаваецца ў шафу альбом у карычневай вокладцы. Час ад часу яго гаспадара патрывожаць успаміны. І ў чарговы раз разам з асэнсаваннем далёкага мінулага прыйдуць усведамленне каштоўнасці жыцця, жаданне вучыцца бачыць яго светлыя моманты і запаўняць добрымі справамі кожны новы дзень.

**Кацярына Рынкевіч**

**Фота Казіміра Блажэвіча**